# УНІВЕРСІТЭЦКІ ВЕСНІК

№ 3 (258)
ЛЮТЫ 2019

Выдаецца з мая 1996 г. Перыядычнасць – 1 раз на месяц

Газета Установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»


## Я НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ АБРАЎ ДАРОГУ, НА ЯКОЙ КАЛЮЧАК БОЛЬШ, ЧЫМ РУЖ...

***Люты аказаўся вызначальным месяцам у лёсе беларускага народнага паэта Аркадзя Аляксандравіча Куляшова: 6 лютага споўнілася 105 гадоў з дня яго нараджэння, а 4 лютага – 51 год з дня яго заўчаснай смерці. А. Куляшоў пражыў не надта доўга, аднак, відаць, для кожнага чалавека жыццё вымяраецца не колькасцю пражытых гадоў, а тым, якую спадчыну пасля сябе пакінуў, які духоўны набытак змог перадаць сваім нашчадкам.***



А.А. Куляшоў

Паэт. Перакладчык. Сцэнарыст. Грамадскі дзеяч. За кожным словам – велізарная карпатлівая праца, частка жыцця, незвычайная канцэнтрацыя сіл і намаганняў. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1947–1978). У 1961 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у 16-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Ёрку. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі...

Нарадзіўся А.А. Куляшоў у вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Яго талент праявіўся вельмі рана. Свой першы верш будучы народны паэт напісаў у 7 гадоў, а ўпершыню апублікаваў свае творы ў клімавіцкай раённай газеце «Наш працаўнік» у 1926 годзе. Праз год вершы Куляшова з'явіліся і ў рэспубліканскім выданні «Чырвоны сейбіт». У 16 год ужо выйшаў першы зборнік яго вершаў «Росквіт зямлі».

Хто з нас не ведае верш «Бывай, абуджаная сэрцам дарагая...», які быў пакладзены на музыку і заняў пад назвай «Алеся» пастаяннае месца ў рэпертуары ансамбля «Песняры»? Словы, якім ужо хутка сотня гадоў, успрымаюцца як толькі што напісаныя, толькі што пакладзеныя на музыку і толькі што пачутыя. А гэты верш закаханы Аркадзь напісаў у чатырнаццацігадовым узросце і прысвечаны ён рэальнай дзяўчыне – Алесі Карыткінай. Калі яны пазнаёміліся, хлопчыку было 11 гадоў, а дзяўчынцы – 13. Лёс не дазволіў ім пражыць разам у каханні і згодзе. Аж праз 50 гадоў яны пачалі пісаць адно аднаму лісты і нават дамовіліся аб сустрэчы ў Быхаве на пошце. Аркадзь Куляшоў імгненна прыехаў на сустрэчу, але ўбачыў здалёк не дзяўчыну, вобраз якой трымаў у памяці з юнацтва, а сталую жанчыну свайго ўзросту... Сустрэча не адбылася, і перапіска прыпынілася.

Жыццё маладога паэта складвалася ўдала. Заканчвае ўніверсітэт, працуе ў газеце «Чырвоная змена», на Беларускім радыё. У пачатку 30-х гг. выйшлі новыя зборнікі вершаў – «Па песню, па сонца» і «Медзі дождж» (1933). Яны прасякнуты пачуццём радаснага самасцвярджэння асобы ў грамадстве, нават у жудасныя для беларускай літаратуры гады. З першага года ўтварэння (1934) з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў і літкансультантам разам з Кузьмой Чорным. Блізка сышоўся з маладымі паэтамі, якія групаваліся вакол студыі тагачаснага літаратурнага аб'яднання «Маладняк», пасябраваў са Змітраком Астапенкам і Юліем Таўбіным – таксама таленавітымі паэтамі. Яны стварылі ўнікальны творчы саюз пад псеўданімам «Мсціслаўцы».

Лёс сяброў Куляшова жахлівы – Змітрок Астапенка быў у 1933 годзе арыштаваны і асуджаны, а Юлій Таўбін у 1933 годзе арыштаваны і ў 1937 расстраляны. Бура рэпрэсій не закранула асабістае жыццё паэта і не адлюстравалася ў яго творчасці. Значна пазней, у 1956 годзе выкрыццё культа асобы Сталіна А. Куляшоў успрыняў вельмі цяжка, у яго здарыўся працяглы творчы крызіс: з 1956 па 1960 год не было надрукавана ніводнага дастойнага ўвагі верша. У 1965 годзе выйшаў з друку цыкл вершаў «Маналог», прысвечаны памяці З. Астапенкі і Ю. Таўбіна. «Маналог» напоўнены глыбокім асабістым перажываннем, вернасцю былому сяброўству і агульнай справе:

Я – ваша памяць,
  вы – маё сумленне,
Я – дрэўка,
  вы – трывалы сцяг на ім...

А. Куляшоў балюча перажываў трагедыю першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Вайна застала Куляшова ў чарговым адпачынку на Хоцімшчыне. Паэт вярнуўся ў Мінск па сям'ю, але яна ўжо з'ехала. 24 чэрвеня ён пакінуў сталіцу, пяшком прайшоў да Оршы, а ў Калініне добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай Арміі. Пасля вучобы ў Ноўгарадскім ваенна-палітычным вучылішчы А. Куляшоў працаваў у армейскай газеце «Знамя Советов».

Бацькі А. Куляшова падчас вайны жылі на акупіраванай тэрыторыі, у Хоцімску. Бацька Аркадзя быў чалавекам чэсным, аўтарытэтным. І таму мясцовыя жыхары абралі яго для работы ў нямецкай камендатуры. Работа была нядоўгай, паўтара месяца. Потым Аляксандра Куляшова арыштавала гестапа і адправіла ў канцлагер. Бацька выжыў, што ўжо само па сабе для таго часу было недаравальным злачынствам: як гэта – працаваць у немцаў, выжыць у няволі?! Аўтарытэт сына пэўным чынам дапамог змірыцца з рэпутацыяй бацькі, аднак яны яшчэ доўга не маглі сустракацца адкрыта.

Падчас франтавога жыцця і ў пасляваенны час А. Куляшоў напісаў выдатныя творы за незвычайна кароткі час – паэмы «Сцяг брыгады», «Дом №24». Найбольш значнымі ў гэты час кнігамі былі зборнікі вершаў «Камуністы», «Новая кніга», «Сасна і бяроза», а таксама паэмы «Цунамі», «Далёка да акіяна», «Варшаўскі шлях».

Памёр А Куляшоў у Нясвіжы. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску. Яго іменем названы вуліцы ў Магілёве, Мінску, Смаргоні. У Мінску на доме № 7 па вуліцы Янкі Купалы, у якім жыў пісьменнік, усталявана мемарыяльная дошка. У вёсцы Новыя Саматэвічы дзейнічае літаратурны музей народнага паэта. З 1978 года імя А.А. Куляшова прысвоена Магілёўскаму дзяржаўнаму педагагічнаму інстытуту, зараз – універсітэту.

Творчасць Аркадзя Куляшова настолькі цесна ўплялася ў жыццё беларускага народа, яна настолькі важная і актуальная, што яшчэ доўга будзе лічыцца сучаснай. Хіба ўласныя неўміручыя радкі не сцвярджаюць неўміручасць паэта?

Хацеў бы век, які ўжо на зыходзе,
Забраць мяне з сабой, а я руку
Гарачую працягваю прыродзе –
З дваццатага ў трыццатае
  стагоддзе.

**В.М. ШАРШНЁВА,**
**дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства.**



А.А. Куляшоў падпісвае зборнік вершаў А. Твардоўскаму. 1949 г.

## Паважаныя калегі, дарагія сябры!

Прыміце сардэчныя віншаванні з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Гэта свята сапраўдных мужчын, мужных і моцных духам, гатовых у любую хвіліну ўстаць на абарону сям'і, дома і Радзімы. Мы ўпэўненыя, што кожны наш абаронца Айчыны годны воінаў Андрэя Полацкага, рыцараў Вітаўта, палкоў Канстанціна Астрожскага, партызанаў і салдат Вялікай Айчыннай вайны.

Жадаем, каб ваша праца была накіравана толькі на мірнае стварэнне, каб пачуццё адзінства, спакою і ўпэўненасці ў бясхмарны заўтрашні дзень заўсёды саграваў вашы сэрцы. Самае галоўнае, каб не плакалі вашы маці, а дзеці жылі ў квітнеючай краіне і адчувалі гонар за сваю Радзіму!

Самы пяшчотны, светлы і цудоўны дзень у годзе – 8 Сакавіка!

Пачатак вясны, пачатак жыцця ў прыродзе, першае цяпло. Дарагія жанчыны, хай гэта цяпло паселіцца ў вашых дамах і душах. Хай прыгажосць прыроды натхняе, а пачатак вясны прадвяшчае пачатак чагосьці вельмі жаданага і прыгожага!

Ад душы жадаем, каб кожны дзень вашага жыцця быў такім, як гэты: напоўнены ўсмешкамі, захапленнем, любоўю, клопатам і радасцю! Са святам!

**Рэктарат і прафкам супрацоўнікаў універсітэта.**

## Віншуем!

Рэктарат і прафкам супрацоўнікаў універсітэта віншуюць з юбілеем

**МАРТЫНАВА Пятра Іванавіча,**
**КАРПАВУ Галіну Іванаўну,**
**КЛІМУЦЬ Ладу Ярaславаўну,**
**ДЗЯМІДАВУ Тамару Міхайлаўну!**

*Жадаем добрага здароўя, плёну ў працы і творчасці, асабістага шчасця, дабрабыту і бадзёрага настрою!*

## МАСШТАБНЫЙ НАУЧНЫЙ ФОРУМ

***20–21 февраля 2019 года в университете состоялась V Международная научная конференция «Математическое образование: современное состояние и перспективы», посвященная 100-летию со дня рождения известного ученого, педагога, профессора Абрама Ароновича Столяра.***

В оргкомитет конференции было представлено 130 докладов, авторами которых являются более 190 человек, среди них 36 докторов и 87 кандидатов наук из Беларуси, Болгарии, Израиля, Казахстана, Латвии, России, Украины.

В рамках работы конференции 19 февраля 2019 года на кафедре методики преподавания математики был организован круглый стол на тему «Проблемы современного математического образования» для участников конференции. В работе круглого стола приняли участие доктора и кандидаты педагогических наук из Москвы и Брянска.

Открыл конференцию 20 февраля декан факультета математики и естествознания Леонид Евгеньевич Старовойтов. С приветственным словом к собравшимся обратился ректор МГУ имени А.А. Кулешова профессор Денис Владимирович Дук, который подчеркнул тот факт, что Абрам Аронович Столяр известен как ведущий специалист в области разработки логических проблем преподавания математики, автор более 100 научных работ, среди которых ряд крупных монографий, изданных не только в республиках СССР – странах нынешнего СНГ, но и за рубежом (Япония, Китай, Болгария, Венгрия, Вьетнам).



В день конференции открыта мемориальная доска А.А. Столяра

Для участников конференции был показан документальный фильм «Ученый, педагог, личность», созданный творческой студией «Взгляд».

Пленарное заседание открыл заслуженный деятель науки Республики Беларусь, доктор педагогических наук, профессор Александр Михайлович Радьков. В своем докладе «Педагогика математики профессора А.А. Столяра» он отметил, что Абрам Аронович тонко чувствовал перспективы развития математики, расширение сфер ее применения и необходимость соответствующей модернизации педагогики математики. Его волновали проблемы дифференциации обучения, компьютеризации учебного процесса, становление новых типов учебных заведений, обеспечение непрерывности математического образования и другие.

В работе конференции приняли участие 14 докторов педагогических наук, 2 доктора технических наук, 32 кандидата физико-математических и педагогических наук, преподаватели, учителя высшей категории, аспиранты, магистранты и студенты.

А.А. Столяр создал свою научно-методическую школу, которая активно развивается и сейчас в исследованиях и практической деятельности кафедры методики преподавания математики МГУ имени А.А. Кулешова, других математических кафедр ведущих университетов страны, его многочисленных учеников и последователей.

Конференция дала еще одну возможность осмыслить состояние и наметить перспективы развития математического образования в Республике Беларусь, продолжить исследование актуальных проблем теории и методики обучения математике, многие из которых видел, сформулировал и определил Абрам Аронович Столяр.

**Т. В. ГОСТЕВИЧ,**
**заведующий кафедрой методики преподавания математики.**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# КРЫЛЫ ДУХОЎНАСЦІ

Маральнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі раней патрабавала вялікіх намаганняў ад дзейнасці куратара вучэбнай групы: пошук тэматыкі куратарскіх мерапрыемстваў, памятных дат, патрэбнай літаратуры. "Варыліся" толькі ва ўласнай ініцыятыве, даводзілася імправізаваць: напрыклад, калі ладзілі свята "Купалле", выкладвалі касцёр, змайстраваны з галінак, прынесеных студэнтамі, пакрыты чырвонай тканінай, падводзілі лямпачку (сімвалізавала вогнішча), баючыся ў скоках праз "агонь" зачапіцца за провад. Касцюмаў, тэхнічнага забеспячэння для модных цяпер спецэфектаў і ў паміне не было... Сёння куратарам лёгка арыентавацца ў бязмежнай інфармацыі таму, што аддзел выхаваўчай работы з моладдзю адказна і загадзя ўсё прадумаў і падрыхтаваў, з улікам рэгіянальных асаблівасцей, традыцый, спецыфікі ўніверсітэта, магчымасцей выкладчыцкага калектыву розных кафедраў – толькі заходзь на сайт або ў сам аддзел, дзе цёпла сустрэнуць і дапамогуць незвычайна добразычлівыя, уважлівыя маладыя прафесіяналы.

Здаецца, нядаўна (а аддзел адзначыў ужо сваё 25-годдзе) з задавальненнем слухала яркія, палымяныя прамовы Т.М. Кузьміной, творчага, актыўнага і адказнага кіраўніка, якая прыйшла ва ўніверсітэт менавіта ў Таццянін дзень і сёлетні юбілей якой супаў са святам выхаваўчага аддзела. Статнасць, вытанчаны густ, знешняя прыгажосць спалучаюцца з яе ўнутраным духоўным багаццем, розумам, дальнабачнасцю. Менавіта Таццяна Мікалаеўна з рэктарам М.А. Аўласевічам сталі ініцыятарамі і арганізатарамі стварэння сённяшняй малатыражнай газеты "Універсітэцкі веснік", разнастайных праектаў і мерапрыемстваў, далі пуцёўку ў жыццёвы творчы і працоўны шлях многім студэнтам-"лідараўцам". Словы "цяжка прывесці да дабра павучаннямі, а лёгка – сваім прыкладам" адрасуем Т.М. Кузьміной, прызванай "ляпіць" чалавечыя душы, выхоўваць найлепшыя маральныя якасці ў нашай моладзі, пацвярджэннем таму і будуць словы ўдзячнасці выпускнікоў МДУ.



Супрацоўнікі аддзела выхаваўчай работы. 2004 г.

**ЮБІЛЕЙ**

Людзі, як расліны, не растуць удала, калі няма добрага догляду. Можна сказаць, пад пільным наглядам Таццяны Мікалаеўны ствараўся надзейны, творчы калектыў выхаваўчага аддзела, у якім і цяпер няма выпадковых супрацоўнікаў. Я.А. Ерашэвіч – яе дастойная пераемніца, заўсёды была першая ў вучобе, выдатніца ў навуцы і кіраўніцтве аддзелам: высакароднасць і праўдалюбства, нягледзячы на маладыя гады, спалучаюцца ў яе характары з вытрымкай, строгасцю і пунктуальнасцю. Сёння ўжо Л.В. Набокава ва ўсім заўважае патрэбнага, карыснага і цудоўнага след, як працавітая пчолка, адчувае прыцягненне, настойліва знаходзіць нектар і толькі ёй вядомымі сцежкамі збірае неабыякавую, таленавітую моладзь, умее далікатна пераканаць і сталых педагогаў у неабходнасці падзяліцца вопытам (аказваецца, і мы на нешта вартыя...), згуртаваць усіх у арганізацыі нейкай прыемнай дзеі, ажыццяўленні цікавага праекта – і нараджаецца поспех, радасць, задавальненне! Людміла Васільеўна заўважае самае значнае, важнае ў рэчаіснасці, бачыць не толькі таго чалавека, што побач, разумеючы яго сутнасць, але і ўсіх увогуле.

Прыклад моладзі паказваюць і такія аксакалы роднай установы, як прарэктар У.В. Ясеў, які як прафесіянал-палітолаг добра разумее, што інавацыйны падыход да арганізацыі адукацыйнага працэсу ў сучасных ВНУ ўзаемнавыгадны не толькі для навукі і практыкі, але і з'яўляецца надзвычай карысным у выхаванні моладзі: дапамагае лепш унікнуць у сутнасць пастаўленых адукацыйных і выхаваўчых праблем, знайсці аптымальныя шляхі іх рэалізацыі ў практычнай дзейнасці. Уладзіміру Віктаравічу ў любой справе характэрныя акуратнасць, дакладнасць, паслядоўнасць. Сур'ёзны, разумны, адказны кіраўнік, ён у той жа час уважлівы, сціплы, добразычлівы і таленавіты чалавек, пра што сведчаць яго жыццёва-паэтычныя радкі, уражваюць і нетрадыцыйна сардэчныя, пяшчотна-патрыятычныя вітальныя словы ветэранам, калегам, студэнтам, напрыклад:

Ведет к успеху кропотливый труд,
и не всегда усыпан путь цветами...
Душевные порывы не соврут:
успешность зарождается мечтами.

*Так вышло, что являюсь ровесником отдела воспитательной работы с молодежью. И абсолютно без пафоса могу сказать – горжусь тем, что именно с ним связаны одни из лучших воспоминаний о студенческой жизни в МГУ. С одной стороны, четвертьвековой юбилей очень знатный, а с другой – столько всего впереди! Вспоминаю много знаковых мероприятий – школа студенческого актива «Лидер», «Лучший будущий учитель», студенческая инициатива, дни первокурсника и многое другое. Уверен, что это только начало... Трудитесь вы с душой, что студенты чувствуют и ценят! Есть у студенчества интерес и азарт, и без этого никуда! А скольким личностям отдел помог сформироваться, реализовать себя и выйти достойными людьми во взрослую жизнь! Большое спасибо! Вы навсегда в памяти! Главное в отделе воспитательной работы – настоящие люди, связанные его душой, Людмилой Васильевной Набоковой! Желаю не сбавлять темпов и продолжать удивлять, удерживая высоко поднятую планку.*

**Александр БЕЛЬСКИЙ,
сотрудник Центра
социологических и политических
исследований БГУ.**

*Выпускники нашего славного университета поздравляют дорогой коллектив отдела воспитательной работы МГУ имени А.А. Кулешова с 25-летием и желают всего самого наилучшего! С уверенностью можем заявить, что студенты вам действительно доверяют, делятся планами и мечтами, прислушиваются к советам. Ваша профессия требует столько любви и терпения, столько фантазии и таланта, столько умений и навыков! Мы благодарны вам, что прививаете студентам любовь к знаниям и творчеству. Может быть, именно благодаря вашим усилиям зарождаются новые ученые с мировым именем, талантливые журналисты и писатели, педагоги и артисты.*

*Желаем вам, дорогие наши воспитатели, мудрости, терпения, любви, здоровья и огромного человеческого счастья!*

**Алеся ТОПСТОВА,
главный редактор газеты
«Трудовая слава»
ОАО «Могилевхимволокно»
от имени коллектива,
на 100% состоящего
из выпускников МГУ.**

Помняцца першыя крокі М.Ю. Ганіна ў студэнцкім кафэ "Лабірынт" і створанай ім студыі "Погляд", дзе моладзь з розных факультэтаў сціпла спрабавала і свае сілы, а цяпер гэта шырока вядомы, шматразова дыпламаваны праект, а сам аўтар стаў сапраўдным кіна- і фотамайстрам. Сумесны з В.І. Еўмяньковым праект "Куляшоўцы" (мне асабліва даспадобы 4 версія) кранае да глыбіні душы, бо перад вачыма яскрава паўстае ўсё насычанае, шматбаковае жыццё ўніверсітэта. А.М. Радзькоў красамоўна, душэўна распавядае пра зацікаўленых, апантаных працаўнікоў, а фон – гістарычна важныя кадры дакументальнай хронікі, умела падабраныя Міхаілам Ганіным, вельмі дарэчныя вехі багатай і славутай гісторыі ўніверсітэта. Хочацца сказаць дзякуй і за шчымлівы напамін пра "афганцаў" – актуальны грамадзянскі праект да сённяшняга часу. У сувязі з ім нельга не ўпамянуць і А.А. Ныркову, без глыбокіх ведаў якой немагчыма было ўявіць ніводнай экскурсіі ва ўніверсітэце і выставы (дарэчы, адкрывалася і праводзілася ёю выстава, прысвечаная Максіму Багдановічу, на добрай беларускай мове, з грунтоўным і цікавым папярэднім аналізам жыцця і творчасці вялікага паэта). Першыя нясмелыя, а затым і ўпэўненыя крокі многіх студэнтаў-мастакоў ("Сівы Магілёў", "Мартаўскі кот", "Акварэльна-алейны твар" і г.д.), у тым ліку Паўла Валадзько, Максіма Тарасава, Яўгена Зайцава спачатку падтрымаў, а затым прапагандаваў і адпраўляў іх работы на рэспубліканскія і міжнародныя выставы таксама аддзел выхаваўчай работы. «АРТ-вакацыі» пачыналі студэнты педагагічнага з паслядоўным умелым далучэннем творцаў з іншых факультэтаў. Новыя электронныя праекты (раней выдаваліся друкаваныя зборнікі "Куратарскіх гадзін", з дапамогай якіх можна было лёгка правесці куратарскую гадзіну, вечарыну, тэставаць студэнтаў), інтэрактыўныя пляцоўкі, квэсты, валанцёрскі рух моладзі – таленавітых выкладчыкаў і студэнтаў – зараз, у век гаджэтаў, асабліва папулярныя. Важна, што пільная ўвага надаецца сацыяльна-педагагічнаму суправаджэнню і псіхалагічнай дапамозе студэнтам, якая надзвычай патрэбна, асабліва першакурснікам, маладым сем'ям.

*Отдел воспитательной работы помнит и знает огромное количество людей разного возраста и статуса! Это место, с которым связано столько эмоций и событий! Вы переживали с нами все: рождение маленькой идеи, которая превращалась в проект, потом в мероприятие, а у некоторых – в свою основную профессию, семью и детей... Такое не каждому дается и разрешается, поэтому вы ангелы, которым нужно находиться рядом со студентами, которых оберегаете и наставляете. Спасибо вам большое, ведь я до сих пор только с улыбкой вспоминаю весь отдел и всегда с удовольствием при встрече вас крепко обниму.*

**Ольга СЕКАЦКАЯ (ЦАРЕНКОВА),
выпускница физмата.**



АВР прапагандуе здаровы лад жыцця на асабістым прыкладзе

*Татьяна Николаевна, поздравляю Вас с большими юбилеями, Вашим и воспитательного отдела, который во главе с Вами вывел в свет столько ищущих и неопытных молодых людей, подтолкнул в правильную и успешную жизнь, снарядил на долгие годы багажом нужных знаний и умений, приобщил к большой и дружной семье, без которой так тоскливо и одиноко во взрослой жизни... спасибо за Ваши крылья, которые всегда в минуты невзгоды накрывали и оберегали нас! Долгих, здоровых и счастливых лет Вам. Пусть Ваше детище ещё очень долго направляет на путь истинный белорусскую молодежь! Наш отдел воспитательной работы однозначно был и остаётся лучшим среди вузов страны!*

**Дмитрий ПЕРМИНОВ,
секретарь комитета БРСМ
университета в 2002-2010 гг.**

У прыведзеных актуальных радках выпускнікоў яскрава раскрываецца ўнутраны стан і светапогляд супрацоўнікаў аддзела, якія ўсе шчыра, адказна працуюць, не лічацца з часам, таму што не могуць жыць інакш. Іх аб'ядноўвае пачуццё калектывізму ў "25-гадовым узросце", кампетэнтнасць і энтузіязм, камунікабельнасць і таварыскасць, дабрыня і любоў да людзей, да Беларусі і творчасці, вера ў маладых, у сваю і іх шчаслівую будучыню. Пажадаем студэнцкай моладзі сапраўднага выхавання – гэта ўпрыгожанне ў шчасці і абарона, прытулак у няшчасці, каб не шкадавалі, што задумвацца пра гэтыя пастулаты пачалі, магчыма, пазнавата. Будзем памятаць і пра парады мудрых, што выхаванне стрымлівае юнакоў, цешыць старых, бедных узбагачае, а багатых упрыгожвае. А супрацоўнікі аддзела выхаваўчай работы заўсёды багатыя на добрае слова, увагу, шчырасць, таму хай наша павага і ўдзячнасць будуць ім залогам справядлівасці, сустрэч з добрымі людзьмі, аптымізму і асабістага шчасця.

**Т. ЯКУБОВІЧ.**

**Фота з архіва АВР.**




Удзельнікі выязнога семінара школы студактыву «Лідар». 2018 г.

# ДА, ЭТО МОЙ УНИВЕРСИТЕТ!

11 лет тому назад я покинула стены университета дипломированным специалистом. Но память по-прежнему хранит десятки фамилий тех, кто меня здесь окружал и создавал культурно-нравственную среду.

Время обучения в университете – это отдельный кусочек жизни, самый яркий и запоминающийся. Нет ни одного дня, который прошел бы для меня впустую или без впечатлений. Университет сделал все возможное, чтобы студенты не только получали знания, но и развивались творчески.

С улыбкой вспоминаю избрание секретарем «первички» БРСМ на факультете и первое знакомство с Дмитрием Петерсоном, участие в научно-практических конференциях, заседаниях школы «Лидер» под руководством Людмилы Васильевны Набоковой и литературного объединения «Натхненне» под руководством Тамары Григорьевны Михальчук, День первокурсника, лыжные соревнования в Печерском лесопарке, поездки на уборку урожая, первые шаги в работе редакции газеты «Университетский вестник» под чутким руководством Людмилы Ивановны Шишаковой...

Благодаря этим и другим добрым делам развивались мои организационные навыки и навыки общения, я научилась работать в команде, выступать перед публикой, ставить цели и их добиваться. Кипела жизнь на факультете славянской филологии. Татьяна Анатольевна Кожурина, Владимир Сергеевич Денисов, Алексей Степанович Лавшук, Сергей Эдуардович Сомов и многие другие преподаватели – это те люди, благодаря которым я, подобно зернышку, «прорастала на благодатной» почве пять лет.

Занимая сейчас ответственную должность, остаюсь благодарной университетскому коллективу за то, что рассмотрели во мне лидерские качества и научили правильно их применять на практике.

Пусть сегодня нет времени часто бывать в родном университете, но, к счастью, у меня есть возможность продлевать свою студенческую жизнь, заходя на сайт МГУ имени А.А. Кулешова, радоваться научным и спортивным достижениям студентов, восхищаться их все новым и новым успехам. А проезжая мимо alma mather, мне не стыдно сказать своим попутчикам: «Это мой университет!»

Пользуясь случаем, коллективу отдела воспитательной работы с молодежью в его 25(!) желаю оставаться таким же динамичным, творческим, успешным! Ведь благодаря вашей поддержке молодые «всходы» крепнут из года в год и уверенно растут на любом жизненном поприще.

Желаю студентам, читающим эти строки, не обмануться в своих надеждах. Для этого нужно любить университет, стремиться быть не созерцателем, а неравнодушной и активной личностью. Вы лучшие! Вперед к вершинам!

**С уважением Ирина
(НЕКРЫЛОВА) КОВАЛЕВА,
главный редактор учреждения
«Редакция Костюковичской
районной газеты «Голас
Касцюкоўшчыны».**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СКАРБНІЦА ЖЫЦЦЯ

***Дзень роднай мовы святкуецца сусветнай супольнасцю 21 лютага. Свята пачало адзначацца з 2000 года. У гэты дзень у 1952 годзе загінула пяць студэнтаў з шэрагу тых, што змагаліся за наданне бенгальскай мове статусу дзяржаўнай у тагачасным Пакістане, усходняя частка якога пазней стала незалежнай дзяржавай Бангладэш.***

Сёння ў свеце шмат цудоўных моў. Адны з іх вабяць сваёй прыгажосцю і непаўторнасцю, другія – мілагучнасцю. Але ў кожнага чалавека ёсць толькі адна родная мова. Менавіта на ёй ён размаўляе з роднымі, сябрамі, знаёмымі. І вельмі дрэнна, калі чалавек пачынае забывацца на сваю мову, не шануе яе.


Удзельнікі дыктоўкі

У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А. Куляшова таксама прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Міжнароднаму дню роднай мовы. Кафедра агульнага і славянскага мовазнаўства гэта свята пачала з дыктоўкі, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі розных факультэтаў і спецыяльнасцей. Тэкст дыктоўкі чытала дацэнт кафедры Ала Міхайлаўна Шубадзёрава, якая падзялілася сваімі ўражаннямі наконт яе правядзення:

– Дзень роднай мовы ніколі не заставаўся па-за ўвагай выкладчыкаў і студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта (раней факультэта славянскай філалогіі): праводзіліся віктарыны, конкурсы чытальнікаў, ладзіліся вечарыны, імпрэзы, аднак галоўнымі ўдзельнікамі і арганізатарамі гэтых мерапрыемстваў былі філолагі. Вельмі хацелася, каб і студэнты іншых факультэтаў не заставаліся ўбаку, былі на такіх урачыстасцях разам з намі. Таму вырашылі паспрабаваць у гэты дзень напісаць дыктант па-беларуску. Мэта дыктоўкі – не толькі і не столькі выявіць найлепшага знаўцу беларускай мовы, а яшчэ раз даць магчымасць прыслухацца да чароўных гукаў роднай мовы, да яе мілагучнасці і напеўнасці. Вельмі хацелася, каб правядзенне такога мерапрыемства стала добрай традыцыяй у нашым універсітэце, тым больш колькасць удзельнікаў у гэтым годзе была ў два разы большай, чым у мінулым. Парадавала тое, што прысутнічалі студэнты розных спецыяльнасцей (будучыя філолагі, гісторыкі, журналісты, выхавальнікі дашкольных устаноў). Спадзяёмся, што ў наступным годзе да нас далучацца прадстаўнікі іншых факультэтаў.

Пасля напісання дыктоўкі ўдзельнікі падзяліліся сваімі ўражаннямі. Студэнтка другога курса спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" М. Шавакава выказалася наступным чынам:

– Я асабіста лічу, што пісаць дыктоўкі патрэбна, каб адточваць і пашыраць узровень валодання роднай мовай. Паколькі я збіраюся звязаць сваё жыццё з настаўніцкай дзейнасцю, мне гэтыя навыкі вельмі неабходныя, і таму я вельмі рада такім мерапрыемствам. Вялікі дзякуй арганізатарам за прапанаваную магчымасць яшчэ раз праверыць свае веды.

Студэнт першага курса спецыяльнасці "Журналістыка" К. Нікіцін сказаў наступнае:

– Напісанне дыктоўкі – гэта выдатнае мерапрыемства для праверкі сваіх ведаў. Паступаючы ва ўніверсітэт, ты ўсведамляеш, што без прыгожай і пісьменнай беларускай мовы прыходзіцца даволі складана. Гэта адчуваецца на любым мерапрыемстве, калі госць аддае перавагу ў выкладзе сваіх думак выключна роднай мове. Такога роду мерапрыемствы могуць даць аб'ектыўную ацэнку тваім ведам і матывацыю пры навучанні. Было вельмі прыемна ўбачыць вялікую колькасць аднадумцаў: студэнты з розных факультэтаў не засталіся абыякавымі да гэтай падзеі і падтрымалі яе. Выказванне «Без мовы няма дзяржавы» мае рацыянальны сэнс. Усё больш і больш востра адчуваецца праблема адсутнасці беларускай мовы ў медыясферы. Мяркую, што падобныя мерапрыемствы – хоць і маленькі, але істотны крок у бок падтрымкі свайго народа і краіны.

А. Сцяпанаў, студэнт першага курса спецыяльнасці "Усеагульная гісторыя", вырашыў наведаць дыктоўку, паколькі хацеў праверыць свой узровень валодання беларускай мовай і асабліва ўзровень ведаў па арфаграфіі і пунктуацыі. Андрэй заўважыў:

– Веданне роднай мовы – гэта абавязак кожнага грамадзяніна сваёй краіны. Беларуская мова вабіць сваёй прыгажосцю, унікальнасцю і меладычнасцю. Падобныя мерапрыемствы павінны набываць больш масавы характар і развіваць патрыятычныя пачуцці ў беларускай моладзі.

Вельмі прыемна, што ў Дзень роднай мовы аўдыторыя не засталася пустой, што з самай раніцы сюды прыйшлі разумныя маладыя людзі, неабыякавыя да роднага слова, роднай мовы, для якіх яна сапраўды з'яўляецца скарбніцай жыцця.

**Віталь ПАЛАВІНСКІ,**
**студэнт 2 курса**
**гісторыка-філалагічнага**
**факультэта.**

# Квіз, квэст і кінаклуб

***Наш універсітэт штогод далучаецца да Міжнароднага дня роднай мовы праз арганізацыю разнастайных адукацыйна-выхаваўчых мерапрыемстваў. У гэтым годзе сумесныя мерапрыемствы з нагоды свята зладзілі выкладчыкі і студэнты факультэтаў замежных моў і пачатковай і музычнай адукацыі.***


Д.А. Доўгаль і А.В. Доўгаль праводзяць віктарыну па беларускай мове

**ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ**

Ініцыятарамі выступілі дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі факультэта замежных моў А.В. Доўгаль і дацэнт кафедры пачатковай адукацыі і лінгвадыдактыкі Д.А. Доўгаль. Ужо стала добрай традыцыяй праводзіць у гэты дзень квіз (віктарыну) "Рускай мове дай разгрузку – размаўляй па-беларуску" з пытаннямі па мове, літаратуры і культуры. Сёлета ў ёй прынялі ўдзел 20 каманд, адна з якіх складалася з выкладчыкаў двух факультэтаў. Па выніках двух тураў былі выяўлены найлепшыя знаўцы беларускай мовы – каманды "Чараўніцы" (група АН-41 ФЗМ) і "Валошкі" (Н-12 ФПіМА).

Працягам святочных мерапрыемстваў стаў квэст на факультэце замежных моў, у якім 8 каманд рашалі складаныя галаваломкі. А на факультэце пачатковай і музычнай адукацыі выкладчыкі і студэнты правялі пасяджэнне кінаклуба "Пятая пара" з праглядам і абмеркаваннем дакументальных фільмаў на беларускай мове.

Падобныя сучасныя формы мерапрыемстваў, як прызналіся ўдзельнікі, робяць вывучэнне роднай мовы цікавым і займальным.

**А.В. ДОЎГАЛЬ, дацэнт кафедры ТіПЛ,**
**Д.А. ДОЎГАЛЬ, дацэнт кафедры ПАіЛ.**

# КОД ПАЭЗІІ КУЛЯШОВА

***105-годдзю з дня нараджэння Аркадзя Куляшова было прысвечана чарговае пасяджэнне літаратурна-мастацкага салона ўніверсітэта, якое адбылося 21 лютага, у Дзень роднай мовы. На мерапрыемстве прысутнічалі сябры Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Казека і Уладзімір Ясеў, прафесар кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый Алесь Мікалаевіч Макарэвіч, выкладчыкі і студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта.***

**ЛІТАРАТУРНЫ САЛОН**

Творчасць Аркадзя Куляшова мае не толькі лакальнае значэнне – яго талент і спадчына агульнаславянскага і агульнаеўрапейскага маштабу. Для нас, куляшоўцаў, усіх тых, хто вучыўся, вучыцца і працуе ў гэтай навучальнай установе, асоба народнага паэта Беларусі набывае сваё, адметнае значэнне.

У.В. Ясеў згадаў той час, калі наш універсітэт вырашаў, імя якога выбітнага дзеяча сабе абраць. "Вельмі сімвалічна тое, што наш універсітэт носіць імя знакамітага паэта, – падкрэсліў выступоўца. – І гэта накладае на нас пэўныя абавязкі: мы павінны ведаць творчую спадчыну Аркадзя Аляксандравіча, уяўляць сабе, якім ён быў чалавекам".

Паэт-філосаф, паэт-грамадзянін, чалавек і беларус, пранікнёны лірык, паэт высокай мастацкай культуры – усё гэта наш Аркадзь Куляшоў. На думку А.М. Макарэвіча, "паэзія Куляшова – гэта складаны код, расчытваць які трэба ўважліва і старанна". Наш славуты зямляк – гэта пясняр пачуццяў, шчырых эмоцый.

Самае ж галоўнае тое, што паэзія Куляшова актуальная і сёння. "Яна прываблівае сваёй глыбінёй, пошукам ісціны і сэнсу жыцця, тэмай памяці і пакаяння, універсальных чалавечых каштоўнасцей", – справядліва лічыць Т.І. Борбат. А найлепшае ўшанаванне памяці паэта, – гэта, безумоўна, чытанне ягоных вершаў, якія шчыра і кранальна гучалі з вуснаў выкладчыкаў і студэнтаў нашага ўніверсітэта – універсітэта імя Куляшова!

**М.І. ЧМАРАВА, дацэнт**
**кафедры літаратуры і**
**міжкультурных камунікацый.**


Студэнты-філолагі чытаюць вершы А.А. Куляшова

# Язык – живая душа народа...

***Студентам историко-филологического факультета посчастливилось принять участие в проведении видеомоста «Язык – живая душа народа» между библиотекой имени И. Шамякина г. Могилева и библиотекой имени А.С. Грибоедова Санкт-Петербургского государственного бюджетного учреждения культуры «Межрайонная централизованная библиотечная система имени М.Ю. Лермонтова». Мероприятие проводилось 21 февраля в библиотеке-филиале № 2 имени И. Шамякина и было посвящено Дню родного языка.***


Награждение победителей видеочемпионата

Участниками не раз отмечалась особенная роль языка в нашей жизни. Выпускники, студенты и педагоги Санкт-Петербургского государственного университета прочитали отрывки из произведений И. Шамякина на польском, украинском, латышском, грузинском и других языках.

Во время встречи были объявлены результаты видеочемпионата «Прочитай, чтобы я тебя увидел». В этот праздничный день победители и их учителя были награждены дипломами, благодарностями и подарками. Участники мероприятия смогли окунуться в волшебный мир белорусского языка, послушать, как он звучит в исполнении победителей видеочемпионата.

Такие мероприятия нужны и важны: они открывают полилигвальный мир, напоминают о значимости языка, о его культуре и возможностях. Тысячи лет язык создавался многими поколениями наших предков, и каждое слово в нем словно искра чистого золота! И чтобы ее не потерять, нужно любить и ценить свой родной язык.

**Дарья ЗУЕВА,**
**студентка I курса**
**историко-филологического**
**факультета.**

# Цели устойчивого развития

***12 февраля на базе Могилевского государственного университета имени А.А. Кулешова прошел семинар, посвященный проблемам вклада журналистов региональных СМИ в продвижение Целей устойчивого развития (ЦУР). В работе семинара приняли участие представители системы государственного управления, журналисты, редакторы региональных газет и студенты университета.***

Семинар прошел при поддержке Федерального правительства Германии. Целью семинара стало повышение информированности журналистов регионального уровня в области устойчивого развития. Присутствующие узнали, что на Саммите в сентябре 2015 года государства – члены ООН – приняли повестку дня ЦУР на период до 2030 года, направленную на решение проблем бедности, социального неравенства, несправедливости, а также проблем, связанных с климатическими изменениями.

Д. Картевич, координатор направления «Устойчивое региональное развитие» Программы поддержки Беларуси «Преодолевая границы», рассказал о путях реализации ЦУР в Беларуси, о его направлениях и о важности освещения данной темы в СМИ. П. Мариненко, заместитель председателя комитета экономики Могилевского облисполкома, рассказал о взаимосвязи всех Целей устойчивого развития и о роли каждого человека в их реализации.

На семинаре была представлена реализация уже успешных региональных практик Кличевского и Костюковичского районов. Участники семинара посетили Зал славы университета, ознакомились с его историей, приняли участие в практикумах на тему ЦУР.

**Юлия ПАПСУЕВА,**
**студентка 1 курса**
**историко-филологического**
**факультета.**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Снова с нами Новый год

***С 4 по 8 февраля 2019 года в Центре китайского языка и культуры прошла неделя, посвященная Китайскому Новому году. В эти дни в университете не только поздравили с праздником студентов – граждан КНР и преподавателей китайского языка, но и познакомили всех желающих с традициями и обычаями китайского народа.***

КУЛЬТУРА ЗАРУБЕЖЬЯ

Китайский Новый год – это не фиксированная дата, она связана с лунным календарем. Праздник наступает во время второго новолуния, следующего за днем зимнего солнцестояния. По григорианскому календарю – это обычно период между 21 января и 21 февраля. Нынешний год в Китае наступил пятого февраля, и его встречали не как 2019, а как 4717-й. При этом китайцы отмечают наступление Нового года долго – пятнадцать дней, в течение которых они придерживаются определенных традиций.

Украшение дома и двора должно быть выполнено в красной цветовой гамме. Китайцы развешивают фонарики, гирлянды, всевозможные украшения и верят, что уборка дома очищает жильцов от неудач, а убранство впускает счастье в дом. На подносе по кругу раскладывают мандарины и апельсины по 8 штук. Восьмерка у китайцев считается символом долголетия. Праздничной одеждой на Китайский Новый год считается одежда ярких цветов, лучше красных, розовых, зеленых либо золотых. Существует примета: чем ярче одет китаец, тем он будет счастливее в новом году.

Главной традицией встречи Нового года в Китае является «семейный сбор»: все родственники, как бы далеко они друг от друга не находились, стараются приехать под один кров, чтобы вместе отпраздновать знаменательное событие. Для китайцев Новый год – торжество именно «семейное».



Традиционными блюдами для застолья являются яства из риса, а также мясные блюда из курицы, бобы. После торжественной встречи Нового года, уже на следующий день, китайцы наносят визиты друзьям и знакомым. В гости принято брать мандарины, которые являются символом денежного благополучия, конверты с деньгами (обязательно красного цвета), небольшие и недорогие сувениры.

Прошедшая в университетском Центре китайского языка новогодняя неделя была насыщена мероприятиями, в которых приняло участие более 250 человек. Началась она с лекции-презентации о праздновании Нового года в Китае, которая была подготовлена преподавателями китайского языка Дин Нин и Ай Джу.

5 февраля был организован круглый стол с участием врачей медицинской бригады больницы г. Нанкин (КНР), работающих в Центре китайской традиционной медицины на базе Центральной поликлиники г. Могилева. В ходе встречи мы познакомились с особенностями точечного массажа, возможностями акупунктуры. Присутствующие получили исчерпывающие ответы на заданные вопросы, начиная с правил здорового питания – до особенностей акупунктурного лечения.

Вечер 6 февраля был посвящен китайской кухне, где одним из новогодних блюд являются пельмени. Их начинка отличается разнообразием: это может быть капуста, кукуруза, фасоль и др. Мы готовили начинку из нескольких сортов мяса с добавлением консервированной кукурузы и китайских специй.

Подавались пельмени с острым соусом. В этот же вечер все присутствующие смогли познакомиться с особенностями чайной церемонии. О ней рассказал Сергей Рыжков – преподаватель английского и китайского языков ИПКиП.

7 февраля в Центре прошли мастер-классы по каллиграфии и плетению китайских узлов. Сергей Рыжков и Андрей Федоров рассказали об истории китайской каллиграфии, продемонстрировали специальные кисти и бумагу, технику написания иероглифов. Все желающие смогли попробовать свои силы в данной технике.

Дин Нин и Ай Джу продемонстрировали особенности техники плетения китайских узлов, каждый из которых имеет свое символическое значение. Затем участники мастер-класса смогли изготовить для себя сувениры в определенной технике плетения.



Завершающее мероприятие недели – музыкально-игровая программа, в которой приняло участие более 50 человек,– прошло 8 февраля. В качестве ведущей выступила магистрант факультета педагогики и психологии детства Пан Янь. В этот вечер звучали стихи и песни на китайском языке в исполнении не только слушателей Центра, но и гостей мероприятия. Активно, эмоционально большинство присутствующих принимало участие в играх, предложенных преподавателями китайского языка, а также слушателем нашего Центра Иваном Козловым. Особый интерес вызвало выступление Андрея Федорова – представителя Могилевского центра даосской йоги и цигун «Фэйлун».

Новогодним подарком для всех присутствующих стало выступление учащихся ГУО «Гимназия № 3 г. Могилева» под руководством преподавателя китайского языка Лью Синьтин. В завершении праздничного вечера все желающие смогли продегустировать настоящий китайский чай.

**Л.Г. ЗАЙЦЕВА,**
**заместитель директора ИПКиП.**

# Республиканский семинар творческих объединений

***20–21 февраля в Брестском государственном университете имени А.С. Пушкина прошло Республиканское методическое мероприятие – творческая встреча руководителей и студентов-участников литературных объединений, студий литературного творчества учреждений высшего образования. В мероприятии приняла участие доцент кафедры общего и славянского языкознания, руководитель литературного объединения «Натхненне» Наталья Александровна Михальчук, а также творческая молодежь нашего вуза – студенты историко-филологического факультета, члены литературного объединения «Натхненне».***

ТВОРЧЕСТВО

Открытие Республиканского методического мероприятия состоялось в форме литературно-музыкального путешествия на малую родину. Жители песенного края Полесья, студенты университета имени А.С. Пушкина, порадовали участников семинара чарующими мелодиями белорусской народной песни, восхитили великолепными голосами, тронули сердца проникновенным исполнением стихотворений Я. Купалы, Я. Колоса, М. Богдановича. В завершении открытия семинара гостей пригласили на интерактивную площадку «Зазывание весны», в которой древний песенный славянский обряд был положен в основу неординарного сказочного квест-представления.



Н.А. Михальчук получает сертификат участника семинара

В рамках научно-методической площадки «Актуальные формы психолого-педагогического сопровождения деятельности творческих объединений студенческой молодежи» перед гостями семинара со своим оригинальным решением заявленной проблемы выступили заведующий кафедрой белорусской филологии БрГУ имени А.С. Пушкина Л.В. Леванцевич, заведующий кафедрой педагогики социального и начального образования доцент И.Г. Матытина, доцент кафедры психологии развития Е.Е. Марченко.

В работе секции «Палитра педагогического и творческого опыта» руководители литературных объединений высших учебных заведений республики рассказали об истории творческих студий, кружков и организаций, об их уникальности, о формах работы, методологии, своих достижениях. Доцент МГУ имени Кулешова Н.А. Михальчук выступила с докладом о 30-летней истории существования литературного объединения «Натхненне». В процессе работы секции своим педагогическим и творческим опытом поделились руководитель Народного литературного музея Витебского государственного университета имени П.М. Машерова О.И. Русилка, руководитель студенческой научно-исследовательской лаборатории «Теория и практика литературного творчества» ВГУ имени П.М. Машерова Е.В. Крикливец, руководитель литературного клуба «Катарсис» Гродненского государственного медицинского университета В.И. Воронец, руководитель народного литературного объединения «Парнас» Белорусской государственной сельскохозяйственной академии А.М. Пугач, руководитель литературного клуба «Ветліца» Белорусского государственного технологического университета Н.Е. Савицкая, начальник центра студенческого творчества «Живое слово» БГПУ имени М. Танка Е.В. Журавская и др.

В рамках студенческой секции «Литчитка» состоялись творческие выступления студентов-авторов из всех регионов республики. Достойно выглядели на мероприятии и талантливые студенты историко-филологического факультета МГУ имени А.А. Кулешова, прочитавшие свои лирические и философские стихотворения: Анна Папикян (3 курс), Кристина Башаримова (4 курс), Татьяна Журко (2 курс).

На следующий день перед гостями и студентами Брестского университета выступила главный редактор журнала «Маладосць» С.Д. Вотинова, призвавшая молодых авторов искать свои неповторимые образы и выражения, избегать тавтологических ошибок, клише и штампов, стремиться к предельной концентрации текста, такому его лаконизму, когда опустить абзац или предложение становится просто невозможным.

Студенты Барановичского государственного университета, участники студии художественного чтения, представили замечательное исполнение стихотворений классиков белорусской литературы в сопровождении музыки и оригинального видеоряда.

Открывать в художественном произведении множество смыслов, постигать авторский замысел путем вдумчивого чтения призвал слушателей в своем выступлении доцент кафедры белорусской филологии БрГУ имени А.С. Пушкина, кандидат филологических наук В.А. Сенькевец. Он назвал художника слова человеком, поцелованным Богом, создателем национального языка.«Бог и поэт – соавторы языка», – сформулировал Василий Адамович. «У каждого народа есть хотя бы одно гениальное произведение, и это произведение – язык», – это моностихотворение Алеся Рязанова, процитированное литературоведом, стало своеобразным лейтмотивом творческой встречи.

И думается, что отнюдь не случайно второй день мероприятия совпал с Днем родного языка. Неотъемлемой и важной частью встречи в Бресте были звучащие в талантливом исполнении стихотворные строки. Я. Колас, Я. Купала, М. Богданович, А. Рязанов, полесские художники слова В. Бакула, А. Таболич, Я. Термелева, Н. Степусь, Д. Басик, Д. Дулевич... Вечно живое слово классиков, образы-озарения поэтов-современников и тут же, рядом – звонкие, летящие ввысь строки студентов-поэтов – вдохновенных, увлеченных, ищущих.

**Н.А. МИХАЛЬЧУК,**
**доцент кафедры общего и славянского языкознания.**

# Магія маёй радзімы

***Сваёй малой радзімай я смела магу назваць пасёлак Грабянёва. Тут прайшлі найлепшыя гады майго дзяцінства. Для большасці мясцовых людзей гэта тэрыторыя асацыіруецца з «цёмнай мясцовасцю», але гэта не так. Я стаўлю перад сабой задачу даказаць, што Грабянёва – маляўнічае месца, дзе жывуць светлыя, дабрадушныя і цікавыя людзі.***

ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Мой пасёлак свабодны ад гарадской мітусні і загазаванасці. Вялікім здабыткам тут з'яўляецца мясцовае возера, або, як яго называюць, Кар'еры, куды ў гарачыя летнія дні з'язджаюцца ледзь не ўсе жыхары Магілёва. Кажучы аб'ектыўна, возера забаронена для купання, як і большасць Магілёўскіх вадаёмаў. Затое які выгляд! Людзям, для якіх эстэтычнае задавальненне іграе не апошнюю ў жыцці ролю, абавязкова варта тут пабываць.

Трэба сказаць, што возера – гэта яшчэ не ўсё. Я не магу пакрыўдзіць увагай Буйніцкае поле, якое размяшчаецца літаральна за два крокі ад майго дома. Буйніцкае поле – цудоўнае месца для адпачынку. Думаю, што не існуе такіх людзей, якія адмовіліся б правесці час у кампаніі сяброў, атрымліваючы асалоду ад прыемнай размовы і найсмачнейшага смажанага шашлыка.



Прайшоўшы пару метраў праз поле, вы ўбачыце жывапісны Дняпро, які велічна і горда працякае тут не адну сотню (а можа, і тысячу) гадоў. Улетку я люблю займацца бегам. І, вядома, выбіраючы тэрыторыю, аддаю перавагу не пыльным дарогам, а прырэчным сцяжынкам, якія шчодра дораць свежае паветра і мірны настрой.

Здавалася б, ці можа быць яшчэ штo-небудзь цудоўнейшае, яшчэ прыгажэйшае, яшчэ больш прывабнае? Можа! Вядома ж, Грабянёўскі лес. Без перабольшвання магу сказаць, што ўсё маё дзяцінства прайшло менавіта там. Памятаю, як мы з сябрамі блукалі па лесе, падбіралі галінкі, надзяляючы іх якасцямі чароўных палачак. Затым, заклікаючы на дапамогу яе вялікасць Магію (а лепш сказаць, нашы дзіцячыя веды пра гэту таемную сілу), імкнуліся вырабляць розныя метамарфозы з усім, што бачылі навокал... Гэта быў чароўны, незабыўны час!

Мясцовыя жыхары наведваюць лес не часта: у асноўным сюды ходзяць у грыбы, на шпацыр, часам можна сустрэць фатографаў, якія шукаюць патрэбны ракурс для сваіх работ.

Пасёлак Грабянёва – месца, дзе пражываюць цыганы. Больш адкрытых, ветлівых, вясёлых і дружалюбных людзей я прасто не ведаю. Яны заўсёды рады гасцям: гэтыя людзі ладзяць такія святы, што ўсе, каму пашчасціла там пабываць, яшчэ доўга будуць іх успамінаць з вялікай асалодай.

Мая малая радзіма – пасёлак Грабянёва. Я нарадзіўся тут і вырас. Не ведаю, як складзецца маё жыццё, куды закіне мяне непрадказальны лёс, аднак смела магу сказаць, што той час, які я тут правёў, быў самай светлай часткай майго жыцця.

**Кірыл НІКІЦІН, студэнт I курса**
**гісторыка-філалагічнага**
**факультэта.**

Універсітэцкі веснік
ЗАСНАВАЛЬНІК
Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова»

Рэдактар С.Э. СОМАЎ
Карэктура: І.І. Талкачова
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212000, г. Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.
☎ 28-31-51

Падпісана да друку а 17 гадзіне 28.02.2019 г. Тыраж 299 экз. Газета набрана і надрукавана ў абласной друкарні (г. Магілёў, вул. Першамайская, 70). Зак. 1420.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова